Весці БДПУ. Серыя 2. 2017. № 2. С. 51–59.

УДК 94(476)"1953/1985":352.071(1-22)

# АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ЎПРАЎЛЕНЧЫ ПЕРСАНАЛ КАЛГАСАЎ І САЎГАСАЎ БССР (1953–1985 гг.)

**М. У. Смяховіч,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык цэнтра новай і навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі*

Паступіў у рэдакцыю 27.01.17.

UDC 94(476)"1953/1985":352.071(1-22)

# ADMINISTRATIVE AND MANAGERIAL PERSONELL OF COLLECTIVE FARMS AND STATE FARMS IN THE BSSR (1953–1985)

**M. Smyakhovich,**
*Candidate of History, Associate Professor, Head of the Center of Modern and Contemporary History of Belarus, Institute of History of NAS of Belarus*

Received on 27.01.17.

У артыкуле разгледжана палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва СССР і БССР па забеспячэнні калгасаў і саўгасаў адміністрацыйна-ўпраўленчым персаналам. Аўтар адзначыў, што корпус упраўленцаў, якому належыла асноўная роля ў арганізацыі калгасна-саўгаснай вытворчасці, з'яўляўся складовай кіруючай наменклатуры савецкай дзяржавы, быў яе ніжэйшым звяном. У артыкуле зроблена высвова, што кампаніі па забеспячэнні калгасаў і саўгасаў спецыялістамі, якія праводзіліся ў СССР і БССР у 1950 – першай палове 1980 г., дапамаглі вырашыць праблему прафесійнай падрыхтоўкі ніжэйшага звяна эліты. У 1984 г. 96 % старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў мелі вышэйшую адукацыю. У сваёй большасці адміністрацыйны персанал калгасаў і саўгасаў працаваў вынікова і добрасумленна. Разам з тым, каля 6–8 % старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў не адпавядалі пасадзе. Злоўжыванне службовым становішчам (прыпіскі, ашуканства, крадзяжы грамадскай маёмасці) у асяроддзі такіх кіраўнікоў былі звычайнай з'явай, што ў канчатковым выніку не дазволіла дзяржаве вырашыць задачу па забеспячэнні сельскай гаспадаркі адказным і высокапрафесійным корпусам адміністрацыйна-ўпраўленчага персаналу.

*Ключавыя словы:* кіраўнік, калгас, саўгас, падрыхтоўка, кампетэнцыя, забеспячэнне, кадравы склад, адпаведнасць пасадзе, вынік.

The policy of the party and state leadership of the USSR and the BSSR on providing administrative and managerial personnel for collective farms and state farms is analyzed in the article. The author has noted that managers service was the lower link of ruling nomenclature of the Soviet state, and also was responsible for the organization of collective farm and state farm production. The author came to the conclusion that campaigns on providing the collective farms and state farms with experts which were carried out in the USSR and BSSR in 1950 – the first half of 1980 have helped to solve the problem of vocational training of the lowest link of elite. 96 % of chairmen of collective farms and directors of state farms had higher education in 1984. In the majority the administrative personnel of collective farms and state farms worked productively and honestly. At the same time, about 6–8 % of chairmen of collective farms and directors of state farms didnot correspond to the post. Abuse of official position (additions, eyewash, thefts of public property) among such heads were an everyday occurrence that finally didnot allow the state to solve a problem of providing agriculture with the responsible and highly professional corps of administrative and management personnel.

*Keywords:* head, collective farm, state farm, preparation, competence, providing, personnel structure, compliance of the post, result.

Важная роля ў арганізацыі калгасна-саўгаснай вытворчасці належыла адміністрацыйна-ўпраўленчаму персаналу: старшыням калгасаў і дырэктарам саўгасаў. Ад прафесіяналізму, арганізатарскіх здольнасцей, наяўнасці лідарскіх якасцей гэтай катэгорыі калгасна-саўгаснага кіраўніцтва ў шмат у чым залежылі вынікі працы гаспадарак. Таму партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР і БССР асаблівую ўвагу надавала вырашэнню кадравага пытання ў сельскай гаспадарцы. Неабходна адзначыць, што спецыяльных навучальных устаноў, якія б рыхтавалі кадры ўпраўленцаў для аграрнай галіны ў СССР і БССР, не было. Разам з тым, старшыні калгасаў і дырэктары саўгасаў уваходзілі ў склад партыйна-дзяржаўнай наменклатуры, былі яе ніжэйшым звяном. У сувязі з гэтым кандыдатуры на пасады старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў падбіраліся і прапаноўваліся партыйнымі камітэтамі: ад ЦК КПБ да райкамаў партыі. Затым у калгасах гэтыя прэтэндэнты абмяркоўваліся і зацвярджаліся на агульных сходах калгаснікаў, а ў саўгасах прызначаліся загадам кіраўніцтва адпаведнага райвыканкама.

Рэпазіторый БДПУ

У беларускай савецкай гістарыяграфіі па пытанні забеспячэння калгасаў і саўгасаў кадрамі ўпраўленцаў у 1953–1985 гг. назапашана пэўная колькасць манаграфічных і дысертацыйных прац. Гэтай праблеме надавалі ўвагу А. Белязо [1], Н. Гудава [2], Г. Дубінчык [3], П. Корнеў [4], А. Люцко [5], І. Міцкевіч [6] і інш. Аднак працы, якія былі выкананы савецкімі даследчыкамі, мелі істотны недахоп. Іх аўтары пазбягалі крытыкі, звярталі ўвагу толькі на станоўчыя вынікі кадравай палітыкі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва СССР і БССР. «Правільная кадравая палітыка ў рашаючай ступені забяспечыла імклівае развіццё эканомікі, навукі, культуры беларускага народа» [5, с. 167], – адзначаў у сваёй манаграфіі А. Люцко. Зразумела, што такі аднабаковы, хвалебны падыход да ацэнкі кадравай палітыкі не дазваляў навукоўцам бачыць недахопы, даваць аб'ектыўную ацэнку становішчу спраў у кадравым корпусе калгаса-саўгаснага кіраўніцтва беларускай рэспублікі.

Мэтай гэтага артыкула з'яўляецца вызначэнне ролі і месца адміністрацыйна-ўпраўленчага персаналу калгасаў і саўгасаў у арганізацыі вытворчасці і развіцці сельскай гаспадаркі БССР, ацэнка палітыкі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР па яе забеспячэнні кваліфікаванымі, высокапрафесійнымі кіраўніцкімі кадрамі.

***Хрушчоўскія кампаніі па вырашэнні кадравага пытання ў сельскай гаспадарцы і іх вынікі.*** У 1953 г. першы сакратар ЦК КПСС М. Хрушчоў лічыў, што вынікі працы калгасаў і саўгасаў у рашаючай ступені залежаць ад працы іх кіраўніцтва, таму ён рабіў пэўныя захады ў кірунку забеспячэння гаспадарак гэтай катэгорыяй упраўленцаў. У першую чаргу звярталася ўвага на ўзровень прафесійнай падрыхтаванасці кіруючых кадраў. Паводле інфармацыі інструктара сельскагаспадарчага аддзела ЦК КПБ С. Ландарскага ў верасні 1953 г. у БССР налічвалася 5406 калгасаў, у тым ліку 4969 узбуйненых. На пасадзе калгасных старшынь працавала 5299 мужчын і 107 жанчын, 3749 (70,7 % ад агульнай колькасці) старшынь былі членамі КПСС, 1587 беспартыйнымі, вышэйшую адукацыю мелі 105 (1,9 % ад агульнай колькасці) чалавек, сярэднюю – 880 (16 % ад агульнай колькасці), незакончаную сярэднюю – 1055 (19 % ад агульнай колькасці) чалавек, пачатковую адукацыю – 3366 чалавек (63,1 % ад агульнай колькасці). З гэтых апошніх 1979 (37 % ад агульнай колькасці) чалавек былі «практыкамі». Сярод старшынь спецыялістамі сельскай гаспадаркі былі 713 (13,4 % ад агульнай колькасці) чалавек, у тым ліку 374 аграномы, 132 заатэхнікі, 117 ветурачоў [7, арк.103].

Прыведзеныя факты сведчаць, што ў 1953 г. абсалютная большасць старшынь калгасаў (63,1 % ад агульнай колькасці) не мела не тое што неабходнай прафесійнай падрыхтоўкі, яна не мела нават неабходнай адукацыі. Больш за тое, на пасадах старшынь працавала 1979 чалавек (37 % ад агульнай колькасці), якія былі «практыкамі», г. зн. увогуле не мелі ніякай адукацыі, нават на ўзроўні пачатковай школы. У той жа час толькі 1,9 % старшынь калгасаў мелі вышэйшую адукацыю і толькі 13,4 % старшынь былі спецыялістамі сельскай гаспадаркі.

Спецыялістаў сельскай гаспадаркі на працягу 4–5 гадоў рыхтавалі вышэйшыя навучальныя ўстановы (ВНУ) адпаведнага профілю, рыхтаваліся яны таксама (у асноўным на працягу трох гадоў) сельскагаспадарчымі сярэднімі спецыяльнымі ўстановамі (тэхнікумамі). Аднак, як правіла, маладыя выпускнікі сельскагаспадарчых інстытутаў і тэхнікумаў не мелі партыйнага білета і вопыту арганізатарскай, выхаваўчай работы з вялікімі працоўнымі калектывамі, якімі былі калгасы і саўгасы. У той жа час на гарадскіх прадпрыемствах, у розных дзяржаўных установах працавала немала здольных, добра падрыхтаваных арганізатараў і спецыялістаў, у тым ліку з сельскагаспадарчымі дыпломамі. Таму ўжо ў 1953 г. па ініцыятыве М. Хрушчова было вырашана правесці кампанію па накіраванні інжынерна-тэхнічных спецыялістаў з прамысловых прадпрыемстваў, міністэрскіх кабінетаў, іншых арганізацый на адміністрацыйныя пасады ў калгасы і МТС. Усяго ў БССР было вырашана накіраваць на працу ў калгасы 5300 спецыялістаў. Аднак з верасня да заканчэння 1953 г. толькі Мінскі абкам КПБ накіраваў некалькі спецыялістаў у МТС, а іншыя абкамы гэтага не зрабілі [7, арк. 89].

Ніхто з гарадскіх спецыялістаў не жадаў мяняць месца працы і жыхарства, асабліва калі справа тычылася калгасаў, якія размяшчаліся ў «глыбінцы», г. зн. далёка ад гарадоў, чыгуначных станцый, прамысловых аб'ектаў. У справаздачы інструктара сельскагаспадарчага аддзела ЦК КПБ Н. Меркулава паведамлялася, што ў Бабруйскай вобласці, дзе было 376 калгасаў і трэба было накіраваць у вёску 430 аграномаў і заатэхнікаў, на 20 лістапада 1953 г. туды было паслана 366 з іх. Н. Меркулаў адзначаў, што спецыялісты прызначаюцца ў МТС і калгасы па іх выбары і, у першую чаргу, у лепшыя калгасы. А ў занядбаныя калгасы і МТС спецыялісты ехаць не хочуць. У выніку ў Бабруйскім раёне з 31 «блізкага» эканамічна моцнага калгаса не меў аграномаў і заатэхнікаў толькі адзін калгас, у той час як 64 калгасы «глыбінкі» не мелі ні аграномаў, ні заатэхнікаў [7, арк. 110, 111].

Інструктар сельскагаспадарчага аддзела ЦК КПБ М. Аляксееў у сваёй даведцы, адасла-

Рэпазіторый БДПУ

най у сакратарыят ЦК КПБ, таксама паведамляў, што ў такіх цэнтральных раёнах Гродзенскай вобласці, як Гродзенскі, Ваўкавыскі, Лідскі, Мастоўскі, калгасы амаль поўнасцю ўкамплектаваны спецыялістамі сельскай гаспадаркі, а аддаленныя раёны – Жалудоцкі, Бераставіцкі і інш. адчуваюць «востры недахоп спецыялістаў» [7, арк.117, 118].

Па інфармацыі загадчыка сельскагаспадарчым аддзелам ЦК КПБ Н. Красікава, якая 20 кастрычніка 1953 г. была адаслана ў сакратырыят ЦК КПБ, за верасень-кастрычнік 1953 г. усяго ў калгасы БССР было напраўлена 219 аграномаў з вышэйшай адукацыяй і 2389 аграномаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, 63 заатэхнікі з вышэйшай і 775 з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй [7, арк. 94].

Такім чынам, факты сведчаць, што становішча з кадрамі ў сельскай гаспадарцы выпраўлялася вельмі марудна, хрушчоўская ініцыятыва шляхам «мабілізацыі» спецыялістаў, якія працавалі ў гарадах, вырашыць кадравае пытанне ў сельскай гаспадарцы не мела поспеху. М. Хрушчова гэта не задавальняла. Чарговая пастанова ЦК КПСС была прынята 25 сакавіка 1955 г., калі разглядалася пытанне «Аб мерах па далейшым умацаванні калгасаў кіраўніцкімі кадрамі». У гэтым дакуменце дэкларавалася, што «найбольш хутка развіваецца грамадская гаспадарка ў тых калгасах, якія ўзначальваюць здольныя, палітычна падрыхтаваныя, адданыя калгаснай справе кадры… Ніякая дырэктыва… не акажа належнага ўплыву на ўздым сельскай гаспадаркі, калі на месцах не будзе добрых выканаўцаў, здольных арганізатараў» [8, с. 60].

У мэтах умацавання калгасаў такімі здольнымі арганізатарамі М. Хрушчоў, па вопыце 1920-х гг., вырашыў разгарнуць працу на прадпрыемствах, ва ўстановах і іншых арганізацыях па падборы вопытных работнікаў з тым, каб да 1 ліпеня 1955 г. у калгасы савецкай краіны было напраўлена «не менш за 30 тыс. чалавек» [8, с. 61].

Спачатку гэтыя добраахвотнікі павінны былі прайсці двухмесячную стажыроўку непасрэдна на фермах і брыгадах у тых абласцях, куды яны павінны былі паехаць працаваць старшынямі ў «эканамічна слабыя калгасы» [8, с. 62]. Вельмі цікавай была тая частка пастановы, якая тычылася заробкаў гэтых добраахвотнікаў. М. Хрушчоў пайшоў на надзвычайны крок – старшыням з ліку «30-тысячнікаў» заработную плату на працягу 3-х гадоў выплочвала дзяржава. У пастанове на гэты конт гаварылася: «Пачынаючы з чацвёртага году даплату старшыні калгаса ад дзяржавы не праводзіць, паколькі да гэтага часу калгас пад кіраўніцтвам старшыні павінен узмацнець, аплата працадня ў калгасе павінна быць высокай, таму і аплата старшыні калгаса на агульных падставах будзе дастатковай» [8, с. 64]. Як бачым, М. Хрушчоў вызначыў трохгадовы тэрмін, на працягу якога добраахвотнікі павінны былі ліквідаваць занядбанасць і вывесці калгасныя гаспадаркі ў катэгорыю «моцных».

Пасля сакавіка 1955 г. кожны беларускі абласны камітэт КПБ пачаў прымаць і разглядаць заявы жадаючых трапіць у склад 30-тысячнікаў. Па рэспубліцы было сабрана каля 3000 такіх заяў, але пасля абмеркавання кандыдатур на пасяджэннях абкамаўскіх бюро на працу старшынямі калгасаў у 1955 г. было напраўлена каля 1 тыс. чалавек [9, арк. 488; 10, с. 475]. Гэты працэс меў месца і ў наступныя гады, таму колькасць старшынь з ліку 30 тысячнікаў вагалася: у 1956 г. з 4760 старшынь калгасаў 1028 былі 30-тысячнікамі, а ў 1957 г. з 4438 калгасных старшынь 1212 былі 30-тысячнікамі [11, арк. 16].

У лістападзе 1955 г. адбылася рэспубліканская нарада старшынь перадавых калгасаў, на якой было абмеркавана пытанне шляхоў дасягнення крутога ўздыму сельскай гаспадаркі рэспублікі. На гэтай нарадзе выступалі старшыні калгасаў з ліку 30-тысячнікаў, якія дзяліліся сваімі ўражаннямі і тымі праблемамі, якія трэба было тэрмінова вырашаць. Старшыня калгаса імя Молатава Ляхавіцкага раёна Сырадоеў у сваёй прамове сказаў: «Старшынёй калгаса я з 15 ліпеня 1955 г. Калі я прыйшоў, адной з найважнейшых асаблівасцей гэтага калгаса было тое, што калгаснікі не верылі кіраўніцтву, пачынаючы ад старшыні і заканчваючы брыгадзірамі. Праўда, у калгаснікаў былі некаторыя падставы не верыць нам. На чым яны засноўваліся? У гэтым калгасе на працягу паўгода перад маім прыездам змянілася 3 старшыні калгаса, два з якіх не жылі ў калгасе, а толькі прыязджалі на працу… Асаблівасць гэтага калгаса заключаецца ў тым, што калгаснікі слаба цікавіліся важнейшымі пытаннямі калгаснай вытворчасці. Шмат хто з іх абыякава адносіцца да становішча спраў у жывёлагадоўлі, паляводстве… члены праўлення былі адасоблены і не мелі перад сабою агульных задач» [9, арк. 79–81].

Старшыня калгаса «Гігант» Грэскага раёна Казлоў заявіў: «Я старшыня з 1 ліпеня 1955 г., наш калгас адстаючы. Ён быў багаты даўгамі, крэдытамі, пазыкамі і старшынямі калгасаў. Мне “пашчасціла” стаць 19 старшынёй калгаса. Частая змена старшынь … пастаянныя падманы калгаснікаў, нізкая аплата працы, – усё гэта прывяло да таго, што калгаснікі перасталі верыць у моц калгаса … у калгасе квітнелі “расташчылаўка” і самавольства» [9, арк. 88].

Сташыня калгаса імя Тэльмана Быхаўскага раёна Дарожкін адзначыў наступнае: «Гаспа-

Рэпазіторый БДТУ

дарка, якую мне прыйшлося прымаць, знаходзілася у выключна цяжкім эканамічным стане. Пасеў азімых і яравых культур быў зроблены амаль без усялякіх угнаенняў. У выніку ўраджай – 2,7 ц/га… Становішча ў жывёлагадоўлі было выключна жудасным… На працягу 8-мі месяцаў калгас не фінансіруецца… У эканамічна слабых калгасах спецыялістаў няма… у гэтых калгасах няма ні аграномаў, ні заатэхнікаў. Трэба паставіць пытанне перад саюзным урадам, каб неяк стварыць матэрыяльную зацікаўленнасць для спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Нельга пакідаць адстаючыя калгасы без спецыялістаў» [9, арк. 103–105].

Безумоўна, партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва ведала аб сапраўдным становішчы калгасных гаспадарак. Але што, акрамя заклікаў, яно магло прапанаваць старшыням калгасаў, мясцовым партыйным кіраўнікам? Таму сакратар ЦК КПБ М. Аўхімовіч у сваёй прамове паведаміў, што за два гады, якія прайшлі пасля вераснёўскага 1953 г. пленума ЦК КПСС, на працу ў калгасы было напраўлена 3649 чалавек на пасаду старшынь, 75 % калгасаў было ўмацавана кіруючымі кадрамі. У МТС было напраўлена больш за 1000 інжынераў, больш за 5000 аграномаў калгасаў [9, арк. 488]. Пры закрыцці нарады старшынь перадавых калгасаў ён сказаў: «Таварышы, уся наша далейшая праца павінна прайсці пад знакам далейшай мабілізацыі калгаснікаў на паспяховае завяршэнне ўсіх чарговых сельскагаспадарчых работ, каб выканаць указанні ЦК КПСС “Аб крутым уздыме ўсіх галін сельскагаспадарчай вытворчасці”» [9, арк. 489].

Такім чынам, вывучэнне і аналіз выкладзеных фактаў дазваляюць зрабіць выснову аб тым, што штодзённая праца калгаснага і саўгаснага кіраўніцтва, грунтавалася на мабілізацыйна-прымусовых метадах гаспадарання, якія не адпавядалі інтарэсам сялянства.

Гэта адмоўна адбівалася на выніках кампаній па ўмацаванні калгасаў і саўгасаў кіраўніцкімі кадрамі. Кадравы корпус калгасных старшынь быў надзвычай неаднародным. Разам з сумленнымі, вопытнымі прафесіяналамі, кіраўнікамі, якія душою хварэлі за паляпшэнне сялянскага жыцця, у гэты корпус трапляла значная колькасць наменклатуршчыкаў, якія не тое што не дбалі, яны сваімі ўчынкамі і адносінамі да справы дыскрэдытавалі працу ўсяго партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва.

Становішча ў кадровым корпусе старшынь калгасаў пачало пагаршацца пасля 1953 г., калі кіруючая наменклатура адчула сваю беспакаранасць і ўседазволенасць. На працягу 2–3 гадоў калгасныя старшыні, у тым ліку 30-тысячнікі атрымлівалі добрую заработную плату і «прыглядаліся» да хрушчоўскіх ініцыятыў, затым яны хутка «перабудоўваліся» і прыстасоўваліся до новай палітычнай рэчаіснасці. Некаторыя з іх убачылі, што дзяржава штогод патрабуе высокія паказчыкі ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. Калі ж калгасныя справы з году ў год не паляпшаліся, такія старшыні станавіліся на шлях махлярства і ашуканства, крадзяжу калгаснай маёмасці.

Гэтая тэндэнцыя набывала пагрозлівы характар, яна станавілася прыкметай хрушчоўскай кадравай палітыкі. У снежні 1958 г. сакратар Магілёўскага абкама партыі К. Мацюшэўскі накіраваў у ЦК КПБ дакладную «Аб развіцці сельскай гаспадаркі ў Магілёўскай вобласці за 1953–1958 гг.». Ён канстатаваў, што ў падборы і выхаванні кадраў старшынь калгасаў дапушчаны сур’ёзныя недахопы, у выніку мае месца вялікая змяняемасць. За перыяд з 1953 па 1958 г. у гаспадаркі гэтай вобласці было напраўлена з гораду 872 спецыялісты, з якіх абласное кіраўніцтва было вымушана замяніць 433 чалавекі (46 % ад агульнай колькасці), у тым ліку 97 старшынь са складу 30-тысячнікаў. Асноўнай прычынай звальнення старшынь калгасаў было тое, што яны не спраўляліся са сваёй работай. На заканчэнне 1958 г. у Магілёўскай вобласці налічваўся 571 калгас, фактычна ў кожным калгасе мянялі старшыню, аднак, нягледзячы на гэта, 167 калгасаў, дзе працавала 23,8 % ад агульнай колькасці па вобласці працаздольных калгаснікаў, паранейшым заставаліся занядбанымі. Заробак гэтых калгаснікаў складаў 857 руб. у год, у той час як па вобласці гэты паказчык складаў 1979 руб. Крэдытная запазычанасць занядбаных калгасаў у сярэднім складала каля 303 тыс. руб. за 1958 г., а некаторыя з іх мелі запазычанасць, якая ў 2 разы перавышала тыя даходы, якія яны атрымлівалі за год [12, арк. 64–69].

Некалькі лепшым, у параўнанні з Магілёўскай вобласцю, было становішча ў Віцебскай вобласці. Сакратар Віцебскага абкама КПБ В. Лабанок 7 снежня 1958 г. таксама адаслаў у рэспубліканскі партыйны штаб дакладную запіску «Аб становішчы сельскай гаспадаркі вобласці». Ён паведамляў, што за 1953–1958 гг. у вобласць было напраўлена 750 чалавек, у тым ліку 355 чалавек са складу 30-тысячнікаў, якія трапілі на пасаду калгасных старшынь, дырэктароў МТС. Аднак на заканчэнне 1958 г. з 667 абласных калгасаў 46 калгасаў, дзе працавалі новыя старшыні, заставаліся эканамічна слабымі, пры тым што ў 1958 г. да 42 лепшых калгасаў шляхам узбуйнення былі далучаны 42 эканамічна занядбаныя калгасы [12, арк. 45, 46].

Гэтыя дакументы сведчаць, што працэс падбору і напраўлення ў калгасы рэспублікі

Рэпазіторый БДПУ

спецыялістаў з горада і прадпрыемстваў у перыяд з 1953 па 1958 г. праводзіўся метадам кампанейшчыны, калі вызначальную ролю адыгрывалі не якасныя характарыстыкі кандыдатаў на пасады калгасных старшынь, не іх прафесіяналізм, а імкненне партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва да рапартаманіі і добрай справаздачнасці. У выніку кадравая кампанейшчына прыносіла больш шкоды, чым карысці. Многія старшыні з ліку партыйна-гаспадарчага актыву, пасланага па наборы 30-тысячнікаў, дыскрэдытавалі аграрную палітыку дзяржавы, што яшчэ больш абцяжарвала калгасныя гаспадаркі, якімі яны кіравалі.

Мабілізацыйныя метады не дазволілі атрымаць станоўчыя вынікі, а калгасныя кіраўнікі з ліку 30-тысячнікаў не дапамаглі вырашыць кадравую праблему. Аб гэтым засведчыў снежаньскі 1959 г. пленум ЦК КПСС, на якім у чарговы раз М. Хрушчоў паўтарыў, што рашаючай умовай у справе забеспячэння ўздыму ўсіх галін сельскай гаспадаркі з'яўляецца «ўмацаванне калгасаў і саўгасаў вопытнымі, кваліфікаванымі кадрамі, якія здольны арганізаваць справу, забяспечыць круты ўздым земляробства і жывёлагадоўлі» [13, с. 25].

***Адукацыйны цэнз і прафесійная падрыхтоўка калгасна-саўгаснага кіраўніцтва.*** Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР і БССР імкнулася, каб пасады вышэйшай гаспадарчай эліты ў сельгасвытворчасці займалі дыпламаваныя спецыялісты. Аднак становішча ў гэтай справе паляпшалася вельмі павольна. Прайшло 12 гадоў з моманту прыняцця рашэнняў вераснёўскім 1953 г. пленумам ЦК КПСС, але кадравае пытанне было далёкім да вырашэння. Сапраўды, у 1965 г. у Беларусі з 2390 кіраўнікоў калгасаў спецыяльную сельскагаспадарчую адукацыю мелі толькі 47,4 % чалавек, з 536 дырэктараў саўгасаў такую ж адукацыю мелі 78,2 % чалавек [14, арк. 24]. Таму ў 1966 г. была прынята чарговая пастанова ЦК КПСС аб далейшым паляпшэнні сістэмы павышэння кваліфікацыі кіруючых кадраў калгасаў і саўгасаў, паводле якой кіраўніцтва Міністэрства сельскай гаспадаркі СССР, ЦК кампартый саюзных рэспублік атрымалі дырэктыву рэарганізаваць у 1965/1966 навучальным годзе аднагадовыя школы падрыхтоўкі кіруючых кадраў калгасаў і саўгасаў, курсы на факультэтэтах павышэння кваліфікацыі кіруючых кадраў калгасаў і саўгасаў сельскагаспадарчых ВНУ, тэрмін падрыхтоўкі на гэтых факультэтах быў вызначаны на працягу 6-ці месяцаў. Акрамя таго, у сельскагаспадарчых ВНУ ствараліся аддзяленні па павышэнні кваліфікацыі кіруючых кадраў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі з тэрмінам навучання на працягу 3-х месяцаў. Слухачоў на гэтыя аддзяленні зацвярджалі ЦК кампартый саюзных рэспублік [15, с. 7,8].

У 1969 г. бюро ЦК КПБ разглядзела пытанне аб падрыхтоўцы спецыялістаў у сельскагаспадарчых тэхнікумах, на той час 28 тэхнікумаў рыхтавалі аграномаў, заатэхнікаў, эканамістаў, бухгалтараў, іншых спецыялістаў для калгасаў і саўгасаў [14, с. 27]. У 1971 г. прафесійную перападрыхтоўку на факультэтах і аддзяленнях сельскагаспадарчых ВНУ ў БССР прайшлі 1364 чалавек са складу адміністрацыйна-кіраўніцкага персаналу калгасаў і саўгасаў [16, арк. 35]. З гэтай мэтай працаваў факультэт павышэння кваліфікацыі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Штогод на гэтым факультэце перападрыхтоўку праходзіла болей за 1400 чалавек з ліку кіраўнікоў і спецыялістаў калгасаў і саўгасаў [17, арк. 1].

У выніку ў 1973 г. ужо 61,8 % старшынь калгасаў мелі вышэйшую адукацыю, 30,4 % – закончаную сярэднюю спецыяльную [18, с. 68]. У 1981 г. 89,3 % старшынь калгасаў мелі вышэйшую адукацыю, але і на гэтай пасадзе ў 26 калгасах яшчэ працавалі практыкі (0,9 % ад агульнай колькасці). У 1984 г. ужо 93,1 % старшынь калгасаў мелі вышэйшую адукацыю, але яшчэ 12 старшынь (0,5 %) былі практыкамі [19, арк. 202]. У 1984 г. вышэйшую адукацыю мелі 96 % дырэктароў саўгасаў [20, арк. 114]. Паводле інфармацыі Мінсельгаса БССР, з-за адукацыйнага фактару штогод каля 12 % старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў пакідалі свае калектывы па ўласным жаданні [19, арк. 202, 209].

Такім чынам, у 1985 г. пытанне адукацыйнага цэнзу адміністрацыйна-гаспадарчага кіраўніцтва калгасаў і саўгасаў у БССР было фактычна вырашана.

Многія кіраўнікі калгасаў і саўгасаў былі высокакваліфікаванымі спецыялістамі і выдатнымі арганізатарамі вытворчасці. Дзякуючы іх намаганням асобныя калгасы і саўгасы дасягалі высокіх вытворчых поспехаў. Гэта былі, як тады пісалі ў газетах, флагманы айчыннай сельгасвытворчасці. Такія гаспадаркі былі ў кожнай вобласці і кожным раёне. У 1960-я гг. сярод перадавых гаспадарак Віцебскай вобласці былі калгасы імя Чырвонай Арміі (старшыня Кац М. І.), саўгас «Дрыссенскі» Верхнядзвінскага раёна (дырэктар Шчарбакоў П. В.).

Сярод гаспадарак Гомельскай вобласці перадавымі былі калгас «Перамога» Буда-Кашалёўскага раёна (старшыня Астапенка В. К.), саўгас «Брылёва» Гомельскага раёна (дырэктар Старавойтаў В. І.), калгас «XXII партз'езд» Гомельскага раёна (старшыня калгаса Хаванскі М. П.), калгас імя Урыцкага Гомельскага раёна (старшыня Паташкін А. А.), калгас

Рэпазіторый БДПУ

«XXI з'езд КПСС» Хойніцкага раёна (старшыня Рабіновіч Б. М.).

У спісе перадавых гаспадарак Мінскай вобласці былі калгасы імя Гастэлы Мінскага раёна (старшыня Шыманскі В. П.), «Савецкая Беларусь» Мінскага раёна (старшыня Палянскі А. Я.), «Перамога» Дзяржынскага раёна (старшыня Сталяроў А. М.), імя Кірава Слуцкага раёна (старшыня Лямешчанка С. Д.), саўгас «Світанак» Мінскага раёна (дырэктар Фунцікаў Б. М.), саўгас «10 год БССР» Любаньскага раёна (дырэктар Крыцкі І. М.), саўгас «Туча» Нясвіжскага раёна (дырэктар Гаўрышчук У. М.) [21, арк. 10,16,38]. Немала лепшых гаспадарак было і ў Магілёўскай вобласці.



Двойчы Герой Сацыялістычнай працы, старшыня калгаса «Аснежыцкі» Пінскага раёна Брэсцкай вобласці У. Ралько, 1985 г. (БДАКФФД 1-09335)[1]

Іх вытворчыя паказчыкі былі дастаткова высокімі. Да прыкладу, у 1965 г. калгас імя Гастэлы Мінскага раёна атрымаў па 85,2 ц мяса на 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў і па 3414 кг малака ад каровы, саўгас «Туча» Нясвіжскага раёна атрымаў па 74,7 ц мяса на 100 га сельгасугоддзяў і па 2333 кг малака ад каровы, саўгас «Брылёва» Гомельскага раёна атрымаў па 71,4 ц мяса на 100 га сельгасугоддзяў і па 2989 кг малака ад каровы [21, арк. 16, 38].

Высокімі былі гэтыя паказчыкі і ў іншых лепшых гаспадарках. Яны вытрымлівалі канкурэнцыю нават з нямецкімі і швецкімі вытворцамі сельскагаспадарчай прадукцыі. Напрыклад, у ФРГ у 1965 г. было атрымана па 3608 кг малака ад адной каровы, ураджайнасць збожжавых склала каля 30 ц/га. [22, с. 10, 15]. У Швецыі ў 1965 г. ад кожнай каровы было атрымана ў сярэднім па краіне па 3300 кг малака, а ў 1966 г. ураджайнасць азімай пшаніцы ў сярэднім па фермерскіх гаспадарках склала каля 28–29 ц/га [23, с. 200, 201].

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за выкананне заданняў пяцігадовых планаў многія кіраўнікі калгасна-саўгаснай вытворчасці ўшаноўваліся дзяржаўнымі ўзнагародамі, высокім званнем Героя Сацыялістычнай Працы. На XXIX з'ездзе КПБ (1981 г.) было канстатавана: «Пытанне аб стабільнасці кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў – гэта тое пытанне, якое ў многім вызначае ўзровень працы нашай сельскай гаспадаркі» [24, с. 48]. У справаздачным дакладзе ЦК КПБ увага дэлегатаў і ўсіх прысутных была звернута на тое, што больш за 30 гадоў узначальвалі калгасныя гаспадаркі вядомыя ўсёй рэспубліцы кіраўнікі: Уладзімір Антонавіч Ралько, Кузьма Іванавіч Шаплыка, Іван Ігнатавіч Дзяржынскі. Звыш 25 гадоў кіравалі калгаснай і саўгаснай вытворчасцю Андрэй Трафімавіч Шакура, Уладзімір Аляксандравіч Баўм, Іван Іванавіч Савенка, ад 20 да 25 гадоў – Васіль Канстанцінавіч Старавойтаў, Уладзімір Лявонц'евіч Бядуля, Уладзімір Міхайлавіч Калачык, Барыс Мікалаевіч Фунцікаў, Васіль Іванавіч Жук [24, с. 48].



У праўленні калгаса «Савецкая Беларусь» Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці: Герой Сацыялістычнай Працы старшыня В. Бядуля; Герой Сацыялістычнай Працы даярка Л. Нічыпарук; брыгадзір С. Трафімаў, 1977 г. (злева направа) (БДАКФФД 0-107547)

Выкладзеныя матэрыялы сведчаць аб тым, што калгаснае кіраўніцтва знаходзілася не тое што пад «уплывам» партыйных камітэтаў, яно было яго складовай часткай. Таму правалы ў калгаснай кадравай палітыцы дзяржаўнага кіраўніцтва СССР і БССР сведчылі аб агульным якасным складзе партыйнай наменклатуры і піраміды ўлады. У такіх умовах разлічваць на хуткае вырашэнне кадравага пытання ў калгасах і саўгасах, а разам з тым і паляпшэнне становішча, уздым сельскай гаспадаркі не прыходзілася.

[1] БДАКФФД – Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў Administrative and management personnel of collective and state farms in the BSSR (1953–1985).

Репозиторий БГПУ

***Адпаведнасць калгасна-саўгаснага кіраўніцтва займаемай пасадзе.*** Як ужо адзначалася, кіраўніцтва калгасаў і саўгасаў уваходзіла ў склад партыйна-дзяржаўнай наменклатуры. Напрыклад, у 1961 г. у склад 131 сельскага райкама КПБ было абрана 1366 калгасных старшынь і 251 дырэктар саўгаса (23,2 % ад агульнай колькасці членаў сельскіх райкамаў), у склад гарадскіх камітэтаў КПБ было абрана 129 старшынь калгасаў і 34 дырэктары саўгаса. Усяго з ліку мясцовага партыйнага актыву: калгасных і саўгасных парт-арганізацый, партыйных камітэтаў мясцовых прадпрыемстваў – на справаздачна-выбарчых сходах і канферэнцыях быў абраны 6951 член сельскіх райкамаў і 1270 членаў гаркамаў КПБ, з іх беларусаў ў сельскіх райкамах было 1478 чалавек (21 % ад агульнай колькасці), гаркамах – 703 чалавекі (55 % да агульнай колькасці) [25, арк. 13].

Тэндэнцыя да пагаршэння складу партыйнай намерклатуры, якая направлялася на працу ў калгасы і саўгасы, была ўстойлівай. Так званыя недахопы ў кадравай палітыцы вельмі дорага абыходзіліся калгасным гаспадаркам. Члены райкамаў і гаркамаў партыі, якія займалі пасады старшынь калгасаў і дырэктароў саўгасаў, вельмі часта не дбалі аб сваіх гаспадарках. Усё часцей на партыйных сходах, канферэнцыях, пленумах і з’ездах пачала гучаць тэма прыпісак і махлярства. Гэтыя з’явы набылі такія маштабы, што замоўчваць іх ужо было немагчыма. У 1961 г. партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва рэспублікі ў асобе К. Мазурава у інфармацыі, якая была адаслана ў ЦК КПСС, было вымушана канстатаваць, што «ў шмат якіх калгасах і саўгасах маюць месца ганебныя факты ашуканства і прыпісак да справаздачы вытворчасці прадукцыі земляробства і жывёлагадоўлі … факты прыпісак маюць месца ў калгасах імя Жданава Жалудоцкага раёна, Імя Сталіна Гродзенскага раёна, шэрагу іншых калгасаў Гродзенскай вобласці, у асобных калгасах іншых абласцей» [25, арк. 85]. У дадатак да прыпісак у асяроддзі калгасна-саўгаснага кіраўніцтва пачалі выяўляцца факты распаўсюджвання крыміналу. Па інфармацыі намесніка Старшыні Вярхоўнага Суда БССР Л. Зайцава, старшыня калгаса «Запаветы Ільіча» Наваградскага раёна І. Кірын у перыяд з 1961 па 1963 г. «шляхам змовы з касірам гэтага калгаса А. Сакалоўскай і бухгалтарам Л. Валенцюкевіч сістэматычна займаўся прысваеннем калгасных грашовых сродкаў у асабліва буйных памерах» [26, арк. 21].

Становішча не змянілася і пасля таго, як да ўлады прыйшло брэжнеўскае кіраўніцтва. Больш за тое, у перыяд з 1965 па 1985 г. так званыя негатыўныя з’явы, распаўсюжаныя сярод корпуса калгасна-саўгаснага кіраўніцтва, набывалі ўсё большыя маштабы. У студзені 1968 г. інструктар ЦК КПБ В. Лашкевіч, пасля праверкі шэрагу калгасаў, у дакладной запісцы на імя П. Машэрава паведамляў, што «факты безгаспадарлівасці, парушэння фінансава-касавай дысцыпліны і занядбанасці ўліку таварна-матэрыяльных каштоўнасцей адпавядаюць рэчаіснасці ў калгасах імя Калініна, імя Ільіча і "Камуніст" Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці» [27, арк. 73]. Не лепшым было становішча і ў шэрагу іншых гаспадарак, менавіта таму мясцоваму кіраўніцтву прыходзілася часта мяняць старшынь калгасаў.

У 1969 г. пракурор БССР І. Пастрэвіч накіраваў міністру сельскай гаспадаркі БССР С. Скарапанаву прадстаўленне «Аб фактах парушэння законаў аб захаванні сацыялістычнай уласнасці ў калгасах і саўгасах». Пракурор паведамляў, што ў 1967 г. у калгасах было ўстаноўлена 1157 выпадкаў недахопу ўласнасці і крадзяжоў, у саўгасах – 819 выпадкаў, у 1968 г. – 1072 такіх выпадкаў у калгасах і 433 выпадкі ў саўгасах. Агульная шкода, нанесеная крадзяжамі калгаснай маёмасці, склала каля 672 тыс. руб. у калгасах і каля 700 тыс. руб. у саўгасах. Пракурор таксама паведамляў, што колькасць асоб, якія былі пакараны за крадзяжы калгаснай маёмасці, склала 16,7 % да ліку ўсіх асоб, якія былі асуджаны за крадзяжы ў БССР. У 1968 г. у ліку асуджаных за крадзяжы было 7 старшынь калгасаў, 25 брыгадзіраў, 37 загадчыкаў фермамі, 78 бухгалтараў. Адначасова пракурор засяроджваў увагу кіраўніцтва міністэрства на фактах безгаспадарлівасці службовых асоб калгасаў, калі ў гаспадарках гінула жывёла [28, арк. 88–93].

У 1971 г. пракуратурай БССР было ўстаноўлена, што ў калгасах «Правда» і «Заря» Кобрынскага раёна за 11 месяцаў 1971 г. загінула 86 галоў буйной рагатай жывёлы і 350 галоў свіней. Аднак прычын іх гібелі ніхто не высвятляў, а страты былі аднесены на сабекошт прадукцыі. Пракуратурскія праверкі зафіксавалі, што ў некаторых калгасах раёна незадавальняюча арганізавана справа захавання калгаснай маёмасці, «не наладжаны належны ўлік матэрыяльных каштоўнасцей» [29, арк. 132].

Зусім невыпадкова ў машэраўскага кіраўніцтва выклікаў трывогу той факт, што за 1971–1981 гг. у большасці калгасаў і саўгасаў рэспублікі былі заменены іх кіраўнікі, у некаторых выпадках нават па два-тры разы. Адзначалася, што на адказныя пасады мясцовыя партыйныя кіраўнікі прызначалі людзей не падрыхтаваных і не правераных, якія потым здымаліся з пасад як «скампраменціраваўшыя сябе» [24, с. 48]. Такія кіраўнікі займаліся мах-

Репозиторий БГТУ

лярствам, ашуканствам, крадзяжамі грамадскай маёмасці дзеля ўласнага дабрабыту.

У студзені 1982 г. калегія Мінсельгаса БССР канстатавала, што ў многіх раёнах не надаецца належнай увагі кантролю за работай кіраўнікоў гаспадарак. Было адзначана, што адной з асноўных прычын адтоку кадраў, з'яўляецца «парушэнне працоўнай дысцыпліны і іншыя непажаданыя прычыны» [19, арк. 31]. Да «непажаданых прычын» было аднесена вызваленне кіраўнікоў і спецыялістаў гаспадарак «як не забяспечыўшых даручаны участак работы» [19, арк. 198]. У 1984 г. менавіта па гэтай прычыне было звалена 6,6 % кіраўнікоў і спецыялістаў калгасаў і 126 дырэктараў саўгасаў. За перыяд з 1982 па 1984 г. 226 дырэктараў саўгасаў (30,0 % ад агульнай колькасці) не справіліся са сваімі абавязкамі і былі вымушаны пакінуць працу [19, арк. 196–198].

У першай палове 1980-х гг., каб схаваць безгаспадарлівасць, не дапусціць гібелі жывёлы, кіраўніцтва калгасаў і саўгасаў ва ўсім Савецкім Саюзе пачалі выкарыстоўваць практыку закупак у дзяржаўным гандлі хлебабулачных вырабаў у мэтах забеспячэння жывёлы кармамі, асабліва ў сакавіку-красавіку, калі назапашаныя кармы заканчваліся. Маштабы гэтай з'явы былі такія, што справай займалася Пракуратура СССР. У красавіку 1985 г. (09.04) Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР, разглядаючы пракурорскія матэрыялы, канстатавала, што да красавіка закончыліся кармы ўвогуле, нават салома, і, каб не дапусціць гібелі жывёлы, гаспадаркі закупалі ў крамах хлебабулачныя вырабы. «Факты скармлівання жывёле харчовых тавараў мелі месца», – паведаміла Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР намесніку міністра сельскай гаспадаркі СССР Л. Кузняцову [17, арк. 23].

Звальненне кіраўнікоў калгасаў і саўгасаў па прычыне незабеспячэння даручанага ўчастка работы не дае магчымасці ўбачыць, што хавалася за гэтым, якія іх дзеянні не задавальнялі райкамы. Да дзеянняў, якія былі распаўсюджаны сярод адміністрацыйна-кіраўніцкага персаналу, адносіліся прыпіскі, падман, ашуканствы. Перш за ўсё гэта тычылася справаздачнасці. Планавыя заданні, якія даводзіліся да калгасаў і саўгасаў, разглядаліся як дырэктыўна-абавязковыя для выканання. І калі ў гаспадарак не атрымлівалася іх выконваць, кіраўніцтва шукала шляхі «карэкціроўкі» лічбаў у штогадовых справаздачах. Факты сведчаць, што безгаспадарлівасць, адсутнасць адказнасці за даручаную справу былі тыповай з'явай у асяроддзі адміністрацыйна-ўпраўленчага персаналу калгасаў і саўгасаў.

Такім чынам, вывучаныя і прааналізаваныя матэрыялы дазваляюць прыйсці да высновы, што, па-першае, кадравы корпус аграрнай вытворчасці з'яўляўся складовай часткай агульнай кіруючай наменклатуры савецкай дзяржавы, быў яе ніжэйшым звяном. Па-другое, палітыка-арганізацыйныя кампаніі, якія праводзіліся ў СССР і БССР у 1950-я – першай палове 1980-х гг., былі адным з кірункаў аграрнай палітыкі па забеспячэнні калгасаў і саўгасаў прафесійнымі кадрамі. Аднак яны не прынеслі запланаванага выніку. У сваёй большасці ўпраўленчы корпус калгасаў і саўгасаў адпавядаў займаемай пасадзе, разам з тым, каля 6–8 % старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў па ўзроўні прафесійнай кампетэнцыі, арганізатарскіх здольнасцях не адпавядалі займаемай пасадзе. Злоўжыванне службовым становішчам (прыпіскі, ашуканства, крадзяжы грамадскай уласнасці) у асяроддзі кіраўнікоў, якія не адпавядалі сваёй пасадзе, былі звычайнай з'явай, што не дазволіла вырашыць задачу па забеспячэнні сельскай гаспадаркі адказным і высокапрафесійным кадравым складам старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў.


Літаратура

1. *Белязо, Е. П.* Крестьянство Белоруссии на пути к развитому социализму (1950–1960 гг.) / Е. П. Белязо ; ред. Н. В. Власенко. – Минск : Наука и техника,1982. – 206 с.
2. *Гудова, Н. Ф.* Деятельность Компартии Белоруссии по подготовке и воспитанию специалистов сельского хозяйства высшей и средней квалификации (1959–1965 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / Н.Ф. Гудова ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1980.– 21 с.
3. *Дубинчик, Г. Ф.* Деятельность Компартии Белоруссии по улучшению состава руководящих кадров колхозов и совхозов (1962–1982 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / Г. Ф. Дубинчик; Институт истории СССР. – М., 1988. – 20 с.
4. *Корнев, П. И.* Партийное руководство развитием животноводства в колхозах и совхозах БССР (1966–1970 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / П. И. Корнев; Белорус. гос. ун-т. – Минск,1983. – 22с.

References

1. *Belyazo, Ye. P.* Krestyanstvo Belorussii na puti k razvitomu sotsializmu (1950–1960 gg.) / Ye. P. Belyazo ; red. N. V. Vlasenko. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1982. – 206 s.
2. *Gudova, N. F.* Deyatelnost Kompartii Belorussii po podgotovke i vospitaniyu spetsialistov selskogo khozyaystva vysshey i sredney kvalifikatsii (1959-1965 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.01 / N. F. Gudova ; Belorus. gos. un-t. – Minsk, 1980. – 21 s.
3. *Dubinchik, G. F.* Deyatelnost Kompartii Belorussii po uluchsheniyu sostava rukovodyashchikh kadrov kolkhozov i sovkhozov (1962-1982 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk: 07.00.02 / G. F. Dubinchik; Institut istorii SSSR. – M., 1988. – 20 s.
4. *Kornev, P. I.* Partiynoye rukovodstvo razvitiyem zhivotnovodstva v kolkhozakh i sovkhozakh BSSR (1966–1970 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk : 07.00.01 / P. I. Kornev; Belorus. gos. un-t. – Minsk, 1983. – 22 s.


Рэпазіторый БДПУ

5. *Люцко, А. В.* Деятельность КПБ по подбору, воспитанию и расстановке руководящих кадров (1946–1950 гг.) / А. В. Люцко. – Минск : Изд-во БГУ, 1975. – 176 с.
6. *Мицкевич, И. Ф.* Деятельность Компартии Белоруссии по подготовке и воспитанию кадров сельского хозяйства (1966–1970 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.01 / И. Ф. Мицкевич ; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 1978. – 19 с.
7. Справки и материалы о подготовке специалистов сельского хозяйства, о повышении квалификации председателей колхозов // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далее – НАРБ). – Ф. 4-п. Воп. 46. Спр. 621.
8. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1971). Издание восьмое. Т. 7. 1955–1959. – М. : Политиздат, 1971. – 559 с.
9. Стенограмма совещания председателей передовых колхозов 22–24 ноября 1955 года // НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 46. Спр. 706.
10. Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии. Часть 2 (1921–1966) / редкол. С. А. Пилотович (председ.) [и др.]. – Минск : Беларусь, 1967. – 586 с.
11. Отчетные материалы по кадрам в сельском хозяйстве // НАРБ. – Ф. 31. Воп. 6. Спр. 783а.
12. Информация и докладные записки ОК КПБ о состоянии нормирования, организации и оплаты труда в колхозах республики // НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 46. Спр. 774.
13. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1971). Издание восьмое. Т. 8. 1959–1965.– М. : Политиздат,1971. – 1972. – 567 с.
14. *Кузнецов, Н. В.* Курсом специализации и концентрации сельского хозяйства: на материалах КПБ (1965–1983 гг.) / Н. В. Кузнецов. – М. : Беларусь, 1984. – 200 с.
15. Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. Сборник документов за 50 лет. Т. 6 (доп.). 1966–1968. – М. : Госполитиздат, 1968. – 816 с.
16. Сводный отчет Министерства сельского хозяйства о подготовке и повышении квалификации кадров сельского хозяйства // НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 189.
17. Справки и письма Министерства сельского хозяйства о развитии сельского хозяйства // НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 3505.
18. *Тарасевич, В. Ф.* Социальное планирование на селе / В. Ф. Тарасевич, В. В. Лешкевич. – Минск : Урожай, 1976. – 144 с.
19. Протоколы заседаний коллегии Министерства сельского хозяйства 7–17 января 1985 г. // НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 3480.
20. Справки об итогах производственно-финансовой деятельности колхозов и совхозов // НАРБ. – Ф. 48. Воп. 14. Спр. 2513.
21. Списки передовых хозяйств и передовиков животноводства колхозов и совхозов // НАРБ. – Ф. 48. Воп. 9. Спр. 6637.
22. *Черемисов, Г.* Сельское хозяйство Федеративной Республики Германии в 1965 г. / Г. Черемисов // Сельскохозяйственная наука и практика за рубежом. Выпуск 9. – М. : ВИНТИСХ МСХ СССР, 1967. – С. 2–18.
23. *Коряжков, Е.* Основы технологии шведского животноводства / Е. Коряжков // Сельскохозяйственная наука и практика за рубежом. Выпуск 9. – М. : ВИНТИСХ МСХ СССР. С. 200–210.
24. Материалы XXIX съезда Коммунистической партии Белоруссии. – Минск : Беларусь, 1981. – 127 с.
25. Копии докладных и информаций, посланных в ЦК КПСС, СМ СССР, союзным министерствам и ведомствам // НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 42. Спр. 555.
26. Письма и жалобы трудящихся, поступившие в ЦК КПБ // НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 65. Спр. 142.
27. Письма и жалобы трудящихся, поступившие в ЦК КПБ // НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 65. Спр. 161.
28. Докладные записки с информацией обкомов партии о выполнении постановлений бюро ЦК КПБ по вопросам сельского хозяйства // НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 46. Спр. 859.
29. Информация прокурора БССР «О нарушениях законности в колхозах республики» // НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 46. Спр. 878.

5. *Lyutsko, A. V.* Deyatelnost KPB po podboru, vospitaniyu i rasstanovke rukovodyashchikh kadrov (1946-1950 gg.) / A. V. Lyutsko. – Minsk : Izd-vo BGU, 1975. – 176 s.
6. *Mitskevich, I. F.* Deyatelnost Kompartii Belorussii po podgotovke i vospitaniyu kadrov selskogo khozyaystva (1966–1970 gg.) : avtoref. dis. … kand. ist. nauk: 07.00.01 / I. F. Mitskevich ; Belorus. gos. un-t. – Minsk, 1978. – 19 s.
7. Spravki i materialy o podgotovke spetsialistov selskogo khozyaystva, o povyshenii kvalifikatsii predsedateley kolkhozov // Natsyyanalny arkhiu Respubliki Belarus (daleye – NARB). – F. 4-p. Vop. 46. Spr. 621.
8. Komunisticheskaya partiya Sovetskogo Soyuza v rezolyutsiyakh i resheniyakh syezdov, konferentsiy i plenumov TsK (1898–1971). Izdaniye vosmoye. T. 7. 1955-1959. – M. : Politizdat, 1971. – 559 s.
9. Stenogramma soveshchaniya predsedateley peredovykh kolkhozov 22-24 noyabrya 1955 goda // NARB. – F. 4-p. Vop. 46. Spr. 706.
10. Ocherki istorii Kommunisticheskoy partii Belorussii. Chast 2 (1921–1966) / redkol. S. A. Pilotovich (predsed.) [i dr.]. – Minsk : Belarus, 1967. – 586 s.
11. Otchyotnyye materialy po kadram v selskom v selskom khozyaystve // NARB. – F. 31. Vop. 6. Spr. 783a.
12. Informatsiya i dokladnyye zapiski OK KPB o sostoyanii normirovaniya, organizatsii i oplaty truda v kolkhozakh respubliki // NARB. – F. 4-p. Vop. 46. Spr. 774.
13. Komunisticheskaya partiya Sovetskogo Soyuza v rezolyutsiyakh i resheniyakh syezdov, konferentsiy i plenumov TsK (1898–1971). Izdaniye vosmoye. T. 8. 1959–1965. – M. : Politizdat, 1971. – 1972. – 567 s.
14. *Kuznetsov, N. V.* Kursom spetsializatsii i kontsentratsii selskogo khozyaystva: na materialakh KPB (1965-1983 gg.) / N. V. Kuznetsov. – M. : Belarus, 1984. – 200 s.
15. Resheniya partii i pravitelstva po khozyaystvennym voprosam. Sbornik dokumentov za 50 let. T. 6 (dop.). 1966-1968. – M. : Gospolitizdat, 1968. – 816 s.
16. Svodnyy otchyot Minsiterstva selskogo khozyaystva o podgotovke i povyshenii kvalifikatsii kadrov selskogo khozyaystva // NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 189.
17. Spravki i pisma Ministerstva selskogo khozyaystva o razvitii selskogo khozyaystva // NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 3505.
18. *Tarasevich, V. F.* Sotsialnoye planirovaniye na sele / V. F. Tarasevich, V. V. Leshkevich. – Minsk : Urozhay, 1976. – 144 s.
19. Protokoly zasedaniy kollegii Ministerstva selskogo khozyaystva 7-17 yanvarya 1985 g. // NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 3480.
20. Spravki ob itogakh proizvodstvenno-finansovoy deyatelnosti kolkhozov i sovkhozov // NARB. – F. 48. Vop. 14. Spr. 2513.
21. Spiski peredovykh khozyaystv i peredovikov zhivotnovodstva kolkhozov i sovkhozov // NARB. – F. 48. Vop. 9. Spr. 6637.
22. *Cheremisov, G.* Selskoye khozyaystvo Federativnoy Respubliki Germanii v 1965 g. / G. Cheremisov // Selskokhozyaystvennaya nauka i praktika za rubezhom. Vypusk 9. – M. : VINTISKh MSKh SSSR, 1967. – S. 2-18.
23. *Koryazhkov, Ye.* Osnovy tekhnologii shvedskogo zhivotnovodstva / Ye. Koryazhkov // Selskokhozyaystvennaya nauka i praktika za rubezhom. Vypusk 9. – M. : VINTISKh MSKh SSSR. – S. 200–210.
24. Materialy XXIX syezda Kommunisticheskoy partii Belorussii. – Minsk : Belarus, 1981. – 127 s.
25. Kopii dokladnykh i informatsiy, poslannykh v TsK KPSS, SM SSSR, soyuznym ministerstvam i vedomstvam // NARB. – F. 4-p. Vop. 42. Spr. 555.
26. Pisma i zhaloby trudyashchikhsya, postupivshiye v TsK KPB // NARB. – F. 4-p. Vop. 65. Spr. 142.
27. Pisma i zhaloby trudyashchikhsya, postupivshiye v TsK KPB // NARB. – F. 4-p. Vop. 65. Spr. 161.
28. Dokladnyye zapiski s informatsiyey obkomov partii o vypolnenii postanovleniy byuro TsK KPB po voprosam selskogo khozyaystva // NARB. – F. 4-p. Vop. 46. Spr. 859.
29. Informatsiya prokurora BSSR “O narusheniyakh zakonnosti v kolkhozakh respubliki” // NARB. – F. 4-p. Vop. 46. Spr. 878.


Рэпазіторый БДТУ